ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 39 (1006) | НЯДЗЕЛЯ, 16-га лютага 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

АДКРЫЎСЯ І-шы УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ „ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ“

Учора ўвечары ў памяшканьні клюбу Савгандльслужачых адкрыўся першы Усебеларускі зьлёт „ЛК“.

З уступнай прамовай выступіў сакратар ЦК ЛКСМБ т. *Палякоў*.

Пасьля абраньня прэзыдыуму, у склад якога ўвайшло 41 чал., і ганаровага прэзыдыуму ў складзе т. т. *Сталіна*, *Варашылава*, *Молатава*, *Калініна*, *Куйбышава*, *Рудзутака*, *Рыкава*, *Косарава і Арджанікідзе*—зьлёт заслухаў прывітаньне прадстаўніка ЦК УсеЛКСМ і ЦКК РСІ СССР тав. *Сайкіна* і даклад прадстаўніка ЦКК КП(б)Б тов. *Лазоўскага* аб барацьбе з бюрократызмам і ролі комсамолу у гэтай барацьбе. На зьлёт зьехалася больш 200 дэлегатаў.

Усе на барацьбу са стратамі ў вытворчасьці

ДА РАБОЧЫХ, РАБОТНІЦ І ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ БССР

Нашы выключныя посьпехі на фронце гаспадарчага будаўніцтва, вялізарны творчы энтузіязм мас, які выяўляецца ў новых, комуністычных формах адносін да працы (соцыялістычнае спаборніцтва, ударныя брыгады, бясьперапынная праца), пaскараюць тэмп індустрыялізацыі краіны і соцыялістычнай рэконструкцыі сельскае гаспадаркі.

Далейшае ўзмацненьне дасягнутых посьпехаў на шляху выкананьня вялікіх работ пяцігодкі ў больш скарочаны тэрмін—за чатыры-тры гады—патрабуе вялізарнага напружаньня сіл, поўнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і самага строгага рэжыму эканоміі ва ўсіх галінах вытворчасьці і кіраўніцтва. Вось чаму перад намі ва ўсёй вострасьці стаіць задача барацьбы са стратамі ў нашай гаспадарцы, барацьбы з няпоўным скарыстаньнем магчымасьцяў паскарэньня тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва.

Нерацыянальнае скарыстаньне сырцу, матар'ялаў, машын, рабочага часу, прастоі на прадпрыемствах, ужываньне ў вытворчасьці дарагіх і дэфіцытных матар'ялаў там, дзе яны могуць быць замененыя больш таннымі і недэфіцытнымі—у выніку ўсяго гэтага мы маем мільёнаныя страты.

Таксама ствараюцца вялікія страты ад нескарыстанага браку, адходаў, адкідаў, нерацыянальнага скарыстаньня электраэнэргіі, апалу, няправільнай організацыі працы. Напрыклад, ёсьць выпадкі, калі пры апрацоўцы драўніны ў фабрыкат, пачынаючы ад лесасекі, траціцца на адходах кала 85 проц. драўлянай масы; у абутковай прамысловасьці траціцца на адход ад 20 да 30 проц. скуранога тавару, адходы мэталяў, асабліва на чыгуначных майстэрнях, дасягаюць 80-85 проц., вялікія страты ад нерацыянальнага скарыстаньня апалу прамысловасьці і г. д.

У гандлі мы трацім ад няўмелага і нядбайнага хаваньня і перавозак тавараў, невыстарчальнай барацьбы з чаргамі, трацім шмат сродкаў на тару, з якое 45 проц. зусім зьнішчаецца. Шмат таксама гіне прадметаў другараднага экспорту, хатніх адкідаў, на што яшчэ можна купіць дадатковую колькасьць трактараў і машын.

Шмат сіл і сродкаў мы трацім у сельскай гаспадарцы ад няпоўнага скарыстаньня глебавых багацьцяў, рабочай жывёлы, машын, ад невыстарчальнай барацьбы са шкоднікамі, з пажарамі.

Эканомія ад зьнішчэньня ўсіх страт можа даць вялізарныя сродкі для будаўніцтва новых фабрык, заводаў, для набыцьця трактараў, для будаўніцтва кватэр, школ і г. д.

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, Савет Народных Камісараў і Цэнтральны Савет Прафэсыянальных Саюзаў БССР зварачваюцца да рабочых, работніц і ўсіх працоўных Беларусі з заклікам шырока і практычна разгарнуць барацьбу са стратамі, увязваючы гэту працу з разгорваньнем рацыяналізатарскіх работ, соцыялістычным спаборніцтвам, дапамогаю рабочаму вынаходніцтву.

Задача профэсыянальных саюзаў фабзавмясцкомаў і вытворчых нарад непасрэдна організоўваць рабочых ва ўдарныя брыгады для барацьбы са стратамі ў цэху, на прадпрыемстве, у савгасе, краме, ва ўстанове, дзеля чаго ўкараняць у гэту справу соцыялістычнае спаборніцтва, практыкаваць організацыю тыдняў, дзесяціднёвак і месячнікаў па барацьбе са стратамі і ператварыць гэтыя ўдарныя заданьні ў сыстэматычную барацьбу са стратамі.

Перад комсамолам стаіць задача організацыі ў гэтай барацьбе ўсёй працоўнай моладзі.

Спэцыялістыя павінны ўзяць на сябе распрацоўку і вывучэньне пытаньняў барацьбы са стратамі і аказаць тэхнічную дапамогу рабочым і бядняцка-серадняцкім масам сялянства ў гэтай барацьбе.

Кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў павінны мабілізаваць сілы і ўвагу адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу і ўсяго апарату на дапамогу пролетарскай грамадзкасьці ў гэтай справе.

Рашучая барацьба са стратамі забясьпечыць нам больш кароткія тэрміны выкананьня пяцігодкі. Усе на барацьбу са стратамі!

Сэкратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.
Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД
Старшыня ЦСПСБ РЫЖОЎ.

КОМСАМОЛ ПАБУДУЕ ПАДВОДНУЮ ЛОДКУ

ВЫКЛІК РЭДАКЦЫЙНАГА КОЛЕКТЫВУ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“

Агульны сход рэдакцыйнага колектыву „Чырвонай Зьмены“ ухваліў адлічыць адзін процант ад месячнай пэнсіі ў карысьць пабудовы падводнай лодкі і выклікае пасьледаваць яго прыкладу рэдакцыі газэт:

„ЗЬВЯЗДА“, „РАБОЧИЙ“, „ЮНГЭР АРБЭЙТЭР“, „ПІОНЭР БЕЛАРУСІ“, „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“, „АКЦЯБР“ і «ОРКА».

Сход рэдакцыйнага колектыву выклікае таксама зрабіць адлічэньні комсамольскія колектывы: МББ (Менск), ЗАВОДУ «БАЛЬШАВІК», ЗАВОДУ «КОМУНАР“, ЗАВОДУ „ЭНЭРГІЯ“, ДОБРУСКАЙ ПАПЯРОВАЙ ФАБРЫКІ „ГЭРОЙ ПРАЦЫ“, ВІЦЕБСКАЙ ФАБРЫКІ „ДЗЬВІНА“ І КОЛЕКТЫЎ СТАНЦЫІ ГОМЕЛЬ.

Сход рэдакцыйнага колектыву выклікае таксама зрабіць АДЛІЧЭНЬНІ ЎСІХ ДЭЛЕГАТАЎ УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЛЁТУ «ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ».

Уносяць 100 руб.

ПРАЦАЎНІКІ ЦК ЛКСМБ ПАСТАНАВІЛІ УНЕСЬЦІ Ў ФОНД ПАБУДОВЫ ПАДВОДНАЙ ЛОДКІ ІМЯ КОМСАМОЛУ 100 РУБЛЁЎ З СВАЙГО ЗАРОБКУ І ВЫКЛІКАЮЦЬ УСЕ АК ЛКСМБ.

Колектыў працаўнікоў.

НЯМЕЦКІЯ СОЦЫЯЛ-ФАШЫСТЫЯ РАЗМАХВАЮЦЬ ФАКЕЛАМ ВАЙНЫ

Ганебнейшыя антысавецкія выпады „Форвэртс“

«Вайна супроць СССР, азначае вайну супроць нямецкага пролетарыяту. Кожны клясава-сьвядомы рабочы Нямеччыны будзе абараняць СССР да апошняй кроплі крыві“

БЭРЛІН, 14. „Ротэ Фанэ“ апублікоўвае сёньня паведамленьне аб падрыхтоўцы антысавецкіх выступленьняў з боку дзяржаўных органаў, на чале якіх стаяць соцыял-дэмократы. „Два дні таму назад—паведамляе „Ротэ Фанэ“ у прускага міністра унутраных спраў Гржэзінскага адбылася нарада аб мяркуемых мерапрыёмствах, накіраваных супроць савецкіх установаў у Нямеччыне“.

„Ротэ Фанэ“ нарэшце піша, што соцыял-дэмократыя Нямеччыны размахвае факелам вайны. Кожны клясава-сьвядомы рабочы Нямеччыны будзе абараняць СССР да апошняй кроплі крыві і ляжа касьцьмі за яго. Вайна супроць СССР азначае вайну супроць нямецкага пролетарыяту. Нямецкі пролетарыят і, абапіраючыся на яго, нямецкія бальшавікі выканаюць у гэтай вайне свой рэволюцыйны клясавы абавязак“.

БЭРЛІН, 14. Нягледзячы на выкрыцьцё тав. Штокерам у Рэйхстаге хлусьлівасьці провакацыйных сьцьвярджэньняў „Форвэртс“ і на абвяржэньне прадстаўніцтва СССР, „Форвэртс“ з бессаромным цынізмам працягвае цкаваньне прадстаўніцтва СССР у Бэрліне, зараз ужо з незамаскоўваемай мэтай—падарваць савецка-нямецкія адносіны.

БЭРЛІН, 14. Новы манэўр, прадпрыняты сёньня „Форвэртсам“ з нябывалай ярасьцю азначае ганебнейшыя мэтады анты-бальшавіцкага паходу у Нямеччыне соцыял-фашыстых. Учора „Форвэртс“ сьцьвярджаў, што „Ротэ Фанэ“ атрымоўвае дапамогу ад савецкіх установаў у Бэрліне. „Форвэртс“ заяўляе, што фінансаваньне „Ротэ Фанэ“ адбываецца шляхам падпіскі з Савецкага Саюзу. СССР,—паведамляе газэта,—выпісвае 5000 экзэмпляраў „Ротэ Фанэ“, што пры падпіснай цане 4.80 маркі ў месяц складае 24 тысячы марак, якія штомесячна атрымоўваюцца з СССР“.

„Антыфашысцкай гвардыі нельга забараніць“

ЦК нямецкага комсамолу заклікае адказваць на забараненьне масавым уступленьнем у КСМ

БЭРЛІН, 14. У адказ на распараджэньне поліцыі аб забараненьні анты-фашысцкіх гвардый моладзі ў Бэрліне, учора ўвечары стыхійна узьніклі на трох бэрлінскіх пляцох дэмонстрацыі рабочай моладзі.


ЦК нямецкага комсамолу апублікаваў адозву, якая канчаецца словамі: „Антыфашысцкай гвардыі нельга забараніць, іх баявы дух жыве. Барацьба супроць фашызму расьце і абвастраецца. Адказвайце на забараненьне масавым уступленьнем у комсамол“.

300 тысяч беспрацоўных у фашысцкай Польшчы

ВАРШАВА, 14. Вядомая лодзінская тэкстыльная фірма „Леонард“ абанкруцілася. „Работнік“ заяўляе ў перадавой, што колькасьць зарэгістраваных беспрацоўных у Польшчы дасягнула 300 тысяч чалавек.

Шалёнае цкаваньне СССР аб'яднае імпэрыялістых усіх адценкаў. Да вою ангельскіх цьвёрдалобых, францускіх рэакцыянэраў і белагвардзейцаў далучыўся і рымскі папа, які выступіў з адозвай па поваду перасьледваньня рэлігійных перакананьняў, якое быццам мае месца ў СССР.

(З газэт)



Уцёрся хлопец у карагод

Сабралі 103 руб.

Па **Мазырскай** *акрузе некаторыя ячэйкі разгарнулі работу па збору сродкаў на пабудову падводнай лодкі імя Комсамолу.*

Комсамольская ячэйка будаўнікоў (Мазыр) сабрала ўжо больш **40** *рублёў.*

Ячэйка № 2 комсамольскага колектыву пэдтэхнікуму праз падпісны ліст сярод комсамольцаў і настаўніцтва сабрала 25 рублёў, і па ячэйцы АІНА сабрана ўжо больш 13 рублёў. Нарада сэкратароў гарадзкога камітэту комсамолу ячэек унесла 25 рублёў.

Я. Сандамірскі

Тэрмінова сабраць сродкі

На раённай конфэрэнцыі **Багушэўскага раёну** (Аршаншчына) пасьля інформацыйнага паведамленьня аб пастанове пленуму ЦК УсеЛКСМ наконт пабудовы падводнай лодкі імя Комсамолу дэлегаты конфэрэнцыі праз спаборніцтва між сабою ў час конфэрэнцыі сабралі 70 рублёў.

Усе комсамольскія ячэйкі разгарнулі работу па збору сродкаў. Конфэрэнцыя ЛКСМБ выклікала ўсю організацыю Беларусі пасьледваць іх прыкладу. **Дрлёнак.**

УНОШУ І ВЫКЛІКАЮ

Я, юнкор **„Чырвонай Зьмены“**, уношу на пабудову лодкі імя комсамолу адзін рубель і выклікаю пасьледваць майму прыкладу **Скарцовіча Я., Чарнушова, Каваленку Я., Бурава Л., Ісурыну** і іншых комсамольцаў Расонскага раёну.

Чарневіч А.

Не адставаць у зборы сродкаў

Другая раённая організацыя комсамолу **Віцебшчыны** распачала па ячэйках збор сродкаў на пабудову падводнай лодкі імя комсамолу. Уперадзе ўсіх ячэек ідзе комсамольская ячэйка фабрыкі **«Профінтэрн“**, якая па свайму прадпрыемству сярод комсамольцаў, беспартыйнай рабочай моладзі і дарослых рабочых сабрала 265 рублёў.

Дарослыя рабочыя прынялі актыўны ўдзел. Стары рабочы **Алейнікаў** ўнёс 5 рублёў за свайго ўнука, рабочыя **Турчын Л., Батхан, Вайман, Іофэ, Зэйф** унесьлі 65 рублёў за сваіх дзяцей, а таксама і другія рабочыя чула адгукнуліся на праводзімае комсамолам мерапрыемства.

Некаторыя комсамольскія колектывы яшчэ не разгарнулі работы. Напрыклад колектывы **МББ, „Чырвоны мэталісты»**, **абутковая фабрыка, ЦРК і акулярная фабрыка** цягнуцца ў хвасьце.

Збор сродкаў мае вялікае значэньне, трэба сабраць іх у працягу аднаго году. **Віцебскі.**

Выклікаем усе будаўнічыя ячэйкі

Абгаварыўшы пастанову сьнежаньскага пленуму ЦК УсеЛКСМ аб пабудове падводнай лодкі на сродкі комсамолу, мы, комсамольскі цэх ячэйкі цэнтральных майстэрняў Белдзяржбуду (Менск), вітаем гэтую пастанову і адначасова лічым, што тэрмін для збору сродкаў—два гады вельмі вялікі, сродкі трэба сабраць на працягу аднаго году.

Рэалізуючы гэтую пастанову, мы адлічаем аднадзённы заробак для пабудовы лодкі, а таксама бярэмся правесьці растлумачальную работу сярод астатняй часткі беспартыйнай рабочай моладзі і дарослых рабочых.

Выклікаем усе будаўнічыя ячэйкі пасьледваць нашаму прыкладу.

Ад імя агульнага сходу ячэйкі А. ВІГДОРЧЫК.

Да бальшавіцкай вясны

4 РАШАЮЧЫХ ДНІ 4

Насеньня абагулена толькі 65 проц.

Комсамольскія арганізацыі! Максымальна мобілізуйце батрацка-бядняцкія і серадняцкія колы моладзі для актыўнага ўдзелу ў вырашэньні баявых задач па колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, вясновай сяўбе, абагуленьні насенных фондаў і маемасьці

Як праходзіць падрыхтоўка да сяўбы па Менскай акрузе

Абагуленьне насеньня. Па даных на 10 лютага па Менскай акрузе процант абагуленага і ссыпанага насеньня ў агульныя сьвірны складае 68,2 проц. На першым месцы па стварэньню насенных фондаў ідзе Бярэзінскі раён—88 проц., Копыльскі—76 проц., Смалявіцкі—73 проц., Вузьдзенскі—73 проц. і Гарадзкая паласа—88 проц.

Злачынна адстаюць Чэрвенскі раён—25 проц., Плешчаніцкі—31 проц., Халопеніцкі—32 проц., Пухавіцкі—35 проц., Заслаўскі—47 проц., Грэскі—41 проц. Бягомльскі—42,3 проц. заданьня.

Бульбы абагулена 74,5 проц. кантрольнага заданьня. На першым месцы ідзе Копыльскі раён—80 проц., Бярэзінскі—78 проц. і Сьмілавіцкі—67 проц. Работа па абагуленьні бульбы ў астатніх раёнах нікудышная і злачынная. Так, напрыклад, па Заслаўскаму раёну абагулена 7 проц., Чэрвенскаму—10 проц., Пухавіцкаму—12 пр. і Грэскаму—25 проц.

Дрэнна праходзіць работа па стварэньню насенных фондаў пры сельскіх камітэтах узаемадапамогі.

На 10 лютага загатоўлена 41 проц. кантрольнага заданьня. Значна адстаюць Заслаўскі, Халопеніцкі і Чэрвенскі раёны.

За дрэнную работу па стварэньню насенных фондаў пры КСТУ **перададзен суду старшыня Грэскага РКСТУ т. Жун.**

Ачыстка насеньня

Ачыска насеньня па акрузе на сёнешні дзень разгорнута вельмі слаба. Усяго ачышчана 36,9 проц. кантрольнага заданьня. На першым месцы па ачыстцы насеньня ідзе Барысаўскі раён—72,9 проц., Сьмілавіцкі—55 проц., Бярэзінскі—44 проц. і Смалявіцкі—42,7 проц. Нікуды нявартa праходзіць ачыстка насеньня па Бягомльскаму раёну—18,9 проц., Плешчаніцкаму раёну—21,3 проц., Лагойскаму—29,3 пр., Асграшыцка-Гарадзецкаму—26,3 проц.

Ячэйкі сьпяць

Для пасьпяховага правядзеньня вясновай пасеўнай кампаніі трэба добра падрыхтавацца. Але аб гэтым і ня думае Крывасельскі сельсавет Копыльскага раёну. Яшчэ і да гэтага часу ня выпрацаваны плян правядзеньня гэтай кампаніі.

Комсамольскія ячэйкі Крывасельская і Астраўская таксама не разглядалі гэтага пытаньня на сваіх сходах. Сэкратары апраўдваюцца тым, што „Яшчэ няма дырэктыў зьверху". Спадзяючыся на дырэктыву зьверху ячэйкі і сельсавет прасьпяць такую значную кампанію.

ВЯСКОВЕЦ.

Бярэце прыклад

Дукорскі колгас імя 16-ці партызанаў ачысьціў усё насеньне. Абагуліў увесь сельска-гаспадарчы інвэнтар і пачаў гэты інвэнтар рамантаваць. Акрамя гэтага агульны сход калгасьнікаў гэтага-ж колгасу пастанавіў правесьці абагуленьне жывёлы. Такім чынам да сяўбы мы будзем добра падрыхтаванымі.

Пісарчык.

Бязьдзейнічаюць...

Падрыхтоўка да вясновай сяўбы Конкавіцкай комсамольскай ячэйкай (Пятрыкоўскі раён) **зусім не распачата.** Няма ніводнага комсамольца, які-б пачаў працу па падрыхтоўцы да вясновай сельска-гаспадарчай кампаніі. Работы па збору попелу не вядзецца.

Бюро ячэйкі не праяўляе зацікаўленасьці ў справе таго, каб падрыхтоўка да вясновай сяўбы стала **стрыжнем штодзённай ячэйковай працы.** Ячэйцы зараз-жа трэба заняцца гэтым пытаньнем, якое ў сучасны **момант мае вялізарнае значэньне.**

Язэп Хвойка.

Справа ідзе добра

Падрыхтоўка да вясны па савгасах Заслаўскага раёну ўжо даўно распачалася. Для правядзеньня падрыхтоўчай кампаніі ў савгасах СТВОРАНЫ УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ ДЛЯ ПРАВЕРКІ ГЭТАЙ ПРАЦЫ. Ударным брыгадам у працы дапамагае батрацтва.

Савгас „Саламарэчча" яшчэ да 10 студзеня ачысьціў сваё насеньне і цяпер на яго машынах ачышчаюць насеньне сяляне. Акрамя гэтага рабочыя савгасу „Саламарэчча" вядуць растлумачальную працу на вёсцы па пытаньнях колектывізацыі і падрыхтоўцы да сяўбы. Рабочыя гэтага савгасу да вясны скончаць організацыю колгасу у в. Угляны, ужо запісалася 10 гаспадарак. І ў іншых савгасах праца ў гэтых галінах ідзе ня горш. Напрыклад, савгас Тарасава ачысьціў сваё насеньне, с.-г. машыны адрамантаваны. Ударныя брыгады вядуць праверку сялянскага інвэнтару і самі прымаюць удзел у рамантаваньні сялянскіх машын. Попел зьбіраецца і добра захоўваецца. Сяляне вёсак бяруць прыклад з савгасаў раёну. Л.

МАЦНЕЕ



Організацыяй груп беднаты ў саюзе з серадняком на глебе суцэльнай колектывізацыі—ліквідуем кулацтва, як клясу.

Ганебна адстаюць

Касьцюковіцкі с-савет і ячэйка ЛКСМБ ня думаюць аб вясновай сяўбе. Пытаньне вясеньняй пасяўной кампаніі яшчэ ня стала стрыжнем у штодзённай працы мястэчковага савету і партыйных ячэек. Між тым, у мястэчку маюцца 2 комсамольскіх ячэйкі і 2 партыйныя ячэйкі.

Раённаму камітэту партыі і комсамолу трэба зьвярнуць увагу і добра прашчупаць сельячэйку, сельсавет і ўдарыць па тых, хто шкодзіць працы.

Цёмны.

З фронту лесазагатовак

Усё яшчэ няма пералому

Апошнія атрыманыя Лесбелам матар'ялы сьведчаць аб тым, што ня гледзячы на адпаведныя захады з боку партыйных і савецкіх організацый, на мясцох ня зроблен яшчэ належны пералом у справе ўзмацненьня вывазкі

Так, за першую дэкаду лютага процант вывазу ў сярэднім выкanан па будаўнічых матар'ялах на 36%, і па дрэву—на 27,8% дэкаднага заданьня. Па асобных лесраёнах процант выкананьня дэкаднага заданьня па вывазцы будаўнічых матар'ялаў ідзе наступным чынам: Барысаўскі лесараён—50.2% Полацкі—47,2% і Мазырскі—33,5%.

Куды горш абстаіць справа з вывазкай загатаванага дрэва. На першым месцы па вывазу лесу стаіць толькі адна Мазырская акруга, якая вывезла 47,5% заданьня.

Вельмі дрэннае становішча з вывазам лесу—у Бабруйскім, Вузьдзенскік і Чэрвенскім раёнах, якія за ўвесь час ходу лесазагатовак адстаюць ад іншых лесараёнаў

Тэмп загатовак лесу і яго вывазу далёка не адпавядае плянавым меркаваньням. З патрэбнай гужсілы ў 203.000 фурманак на першай дэкадзе працавала толькі 76 тысяч, альбо 37,4%.

РВК, сельсаветы да гэтага часу нярэдка застаюцца ў баку ад вывазкі лесу і ня прымаюць конкрэтных мерапрыемстваў да паглыбленьня гэтай працы.

Дзякуючы адсутнасьці растлумачальнай работы вакол вывазу лесу, кулак карыстаецца гэтым і распаўсюджвае чуткі, што быццам заробленыя грошы на вывазцы лесу будуць залічаны ў сельгаспадатак і інш.

Да гэтага часу паступае шмат скаргаў на працу спажывецкіх таварыстваў аб незабесьпячэньні вазакоў продуктамі і фуражом.

Па Полацкаму раёну на вывазцы лесу па даных на 11 лютага працавала толькі 2766 фурманак, альбо 15% патрэбнай колькасьці.

Старшыня Наўліцкага сельсавету Ветрынскага раёну на просьбу дзесятніка Лесбелу аказаць дапамогу даў такі адказ: „КАЛІ ВАМ ПАТРЭБНЫ ПАДВОДЫ, ДЫК ДАМАГАЙЦЕСЯ САМІ". На Вобыльскім вучастку варожыя элемэнты распаўсюджваюць сярод сялянства розныя плёткі, чым падрываецца пасьпяховасьць правядзеньня месячніку. Кулакі да гужпаліннасьці да гэтага часу сельсаветамі прыцягнуты мала. Колгасы і да гэтай пары яшчэ не раскачаліся і ня прымаюць ніякага ўдзелу ў вывазцы.

Белкоопсаюзам яшчэ ня прынятыя рашучыя катэгорычныя меры да спажывецкіх таварыстваў, якія не забясьпечваюць лесазагатоўчыя вучасткі.

Х.

Мобілізацыя 95

Плян лесазагатовак выкананы толькі на 22 проц. Выходзячы з меркаваньняў часу і плянавых заданьняў для Віцебскай акругі гэтага мала. Надаючы вялікае значэньне своечасоваму выкананьню лесазагатовак, другая раённая організацыя комсамолу Віцебшчыны мобілізавала на лесазагатоўкі 95 рабочых хлопцаў-комсамольцаў. Іх зьнялі з вытворчасьці і паслалі на лесазагатоўкі.

Пасылкай мы дасягнулі, папершае — узмацненьня пролетарскай праслойкі і пролетарскага кіраўніцтва сярод лесарубаў, што працуюць на лесасеках і падругое, гэтыя комсамольцы разгортваюць соцспаборніцтва і вядуць культурна-масавую працу сярод лесарубаў і сялянства. Комсамольцы колектыву МББ чыгункі, і Чырвонага металісту, ад'яжджаючыя на лесазагатоўкі абвясьцілі сябе ўдарнікамі на лесазагатоўках і культурным фронце

Гэта мобілізацыя была добрым экзаменам для райорганізацыі, якая організацыя ў цэлым вытрымала з посьпехам за выключэньнем двух таварышоў, па шкурніцку падышоўшых да гэтага пытаньня, якія здрэйфілі перад цяжкасьцямі і адмовіліся ад паездкі. Комсамольскія ячэйкі выключылі іх з організацыі, як нязгодных дапамагаць партыі ў будаўніцтве краіны і як шкурнікаў, якія свае ўласныя інтарэсы ставяць вышэй інтарэсаў грамадзкіх.

Вельмі дрэнна абстаяла справа з спэцвопраткай, але комсамольскія ячэйкі і з гэтага знайшлі выхад.

З дапамогай некаторых партыйцаў сабралі грошы і купілі для мобілізаваных сваёй ячэйкі спэцвопратку. Так прайшла мобілізацыя комсамольцаў на гаспадарчы фронт—лесазагатоўкі.

Э. І.

16-га лютага, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Дому Пісьменьніка (Савецкая. 68) адбудзецца чарговы адкрыты сход ячэйкі БДВ і рэдакцый газэт.

На абвестцы дню: 1. Даклад старшыні ЦСПСБ тав. І. П. РЫЖОВА аб адзінаначальлі, 2. Інфармацыя аб падрыхтоўцы да ўнечарговай чыоткі апарату БДВ і 3. Бягучыя справы.

БЮРО ЯЧЭЙКІ КП(б)Б.

1-я Усебеларуская выстаўка прамысловасьці і сельскай гаспадаркі

У жніўні месяцы 1930 г., у Менску, па Барысаўскаму гасьцінцу, у 2 кілёмэтрах ад цэнтру гораду адчыняецца 1 усебеларуская выстаўка сельскае гаспадаркі і прамысловасьці, якая працягнецца 2 месяцы.

Адчыненьне ўсебеларускай выстаўкі прысвячана да сьвяткаваньня 10-годзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў, таму выстаўка зьяўляецца ня толькі аглядам нашых дасягненьняў, якія маюцца за 10 год існаваньня БССР, але і вялізарнейшым гістарычным момантам і паказчыкам таго, што БССР толькі знаходзячыся ў Саюзе Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік і пры яго значнай матар'яльнай дапамозе, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, шпаркімі крокамі прышла да соцыяльна-эканомічнага росквіту.

Якія задачы стаяць перад выстаўкай

1-я ўсебеларуская выстаўка сельскае гаспадаркі і прамысловасьці ставіць сваёй задачай:

Яскрава адзначыць кіруючую ролю комуністычнае партыі ў індустрыялізацыі краіны і соцыялістычным будаўніцтве пад лёзунгам: „Партыя і Ленін у соцыялістычным будаўніцтве".

Паказаць усё лепшае ў нашым соцыялістычным будаўніцтве за 10 год з аднačасовым параўнаньнем вамоўных бакоў, перашкаджаючых разьвіцьцю соцыялістычнага сэктару, асабліва ў галіне колектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Узварушыць усю савецкую грамадзкасьць для выкананьня пяцігодкі соцыялістычнае перабудовы ўсяе народнае гаспадаркі, шырока скарыстоўваючы вопыт соцспаборніцтва, як адну з форм большага ўцягненьня ўсяе рабочае клясы, батрацтва, бядняцка-серадняцкіх мас у справу соцыялістычнае рэконструкцыі.

Вызначыць ролю буйных гаспадарак у соцыялістычнай рэконструкцыі і перавагу іх перад дробнай гаспадаркай, сапраўды згуртаваўшы ўвагу ўсіх удзельнікаў усебеларускай выстаўкі навакол гэтага пытаньня і дабіцца, каб усе экспонаты паказалі значэньне буйнае гаспадаркі ў рэконструкцыйны пэрыод.

Выявіць вынікі ліквідацыі кулака, як клясы, замены яго вытворчасьці—вытворчасьцю колгасаў і савгасаў, шырока адбіўшы ролю рабочае клясы ў колгасным будаўніцтве.

Як відаць, усебеларуская выстаўка ставіць перад сабой вялізарнейшыя задачы і справіцца з гэтымі задачамі мажліва толькі пры ўмове шырокага ўдзелу ўсяе рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі.

На выстаўцы ў натуральных і графічных экспонатах будзе прадэмонстравана ўся народная гаспадарка за годы існаваньня БССР.

У асобным кутку на выстаўцы будуць сабраны матар'ялы, адбіваючыя ролю КП(б)Б у справе кіраваньня народнай гаспадаркай БССР. Соцспаборніцтва, як адна з форм, садзейнічаючых хутчэйшаму ажыцьцяўленьню пяцігодкі, будзе таксама высьветлена на выстаўцы.

Прамысловасьць на ўсебеларускай выстаўцы яскрава пакажа свае дасягненьні і выявіць сваю кіруючую ролю ў рэконструкцыі сельскае гаспадаркі па соцыялістычным шляху.

Пастаўленыя перад выстаўкай задачы могуць быць выкананы, калі нашы партыйныя, профэсыйныя і комсамольскія організацыі, усе савецкія ўстановы, ад наркамату і да сельсавету шырока разгорнуць падрыхтоўчую працу і ўцягнуць у гэтую справу рабочых, батракоў і бядняцка-серадняцкія масы вёскі. Савгасы, колгасы і ўся прамысловасьць павінны зьявіцца асяродкамі падрыхтоўчае працы да выстаўкі.

Усебеларуская выстаўка ня толькі выявіць свае дасягненьні, але і пакажа ўсе перашкоды, якія затрымліваюць соцыялістычную перабудову народнае гаспадаркі.

Выстаўка зьявіцца школай для экскурсантаў, якія наведаюць яе.

Таму трэба прыняць усе захады, каб у сапраўднасьці ўсе процэсы соцыялістычнае перабудовы народнае г-кі БССР, пролетарская культура, мастацтва, друк паказалі-б свае дасягненьні, якія яны маюць пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі.

Аднačасова з падрыхтоўкай да Усебеларускага агляду сельскае гаспадаркі і прамысловасьці, чакаецца ўдзел на выстаўцы і Ўсесаюзнай прамысловасьці.

З чаго складаецца выстаўка

Выстаўка будзе прадстаўлена двума сэктарамі: сельскае гаспадаркі і прамысловасьці, якія разьмешчаны на тэрыторыі ў 75 га і ў 24 павільёнах. Апрача таго, аддзел расьлінагадоўлі ў натуральным выглядзе прадэманструе тыповыя севазвароты Беларусі і выявіць тыя, якія мяркуецца ўвесьці ў аграіндустрыяльных камбінатах БССР.

Як прадстаўлена будзе сельская гаспадарка

Сельска-гаспадарчы сэктар організоўваецца ў шчыльнай сувязі з працай навукова-дасьледчых установаў БССР. Для дэмонстрацыі ў натуры севазваротаў, сэлекцыі і насеннаводзтва, тэхкультур, кормаздабываньня, пладовага саду, ягадных насаджэньняў і інш. скарыстоўваецца плошча для памянёных культур у 24 га, а для дэмонстрацыі с-г. машын вызначана плошча ў 21 га. Уся тэрыторыя ўжо прыведзена ў належны парадак і агароджана.

Хто прымае ўдзел на выстаўцы

На выстаўцы будзе прадстаўлен абагулены сэктар (савгасы, колгасы і вытворчыя аб'яднаньні) ня менш 75 пр. і бядняцка-серадняцкія г-кі каля 25 пр.

Па рольніцтву чакаецца ўдзел 1000 гаспадарак і па жывёлагадоўлі 1600 галоў рознае жывёлы. Перапрацоўка с-г. продуктаў прадстаўляецца ў гатовым выглядзе і абагулены сэктар зойме месца на 100 проц. Чакаем, што абагулены сэктар па с-г. зойме ня менш 80 проц., а вызначаная колькасьць 75 проц. зьяўляецца самай мінімальнай.

Кіпрыянец.

(Працяг будзе).

ФЗВ--НАЙЛЕПШАЯ ФОРМА ПАДРЫХТОЎКІ КВАЛІФІКАВАНЫХ КАДРАЎ

Недысцыплінаванасьць, нядбайнасьць да працы, псаваньне матар'ялаў, прагулы, спазьненьні—вось што характэрна для гомельскай і менскай школ ФЗВ чыгуначнікаў

Задача комсамольскіх ячэек школ ФЗВ і вышэйшых кіруючых комсамольскіх організацыі, як мага хутчэй зьнішчыць гэтыя зьявішчы

Перадавы па выкліках--апошні па рабоце

Фабзавучы павінны ў першую чаргу падхопліваць усе мерапрыемствы, якія зараз праводзяцца, яны павінны быць застрэльшчыкамі. Але Гомельскі ФЗВ гэтага ня выконвае. Напрыклад,—соцспаборніцтва. Рачей, калі ўсюды крычалі аб спаборніцтве, ФЗВ таксама пачаў раскачвацца. Выклікалі жлобінскі ФЗВ. Два дэлегаты былі выбраны для паездкі ў Жлобін для заключэньня дагавору. Склалі вялікі дагавор, у якім далі абяцаньне, што ўзятыя абавязкі яны выканаюць з гонарам. Але абяцаньне засталося пустым гукам.

Ніводнага разу, як належыць, не правяралі выкананьне соцдагавору. Жлобінцы неаднокраць дасылаюць лісты, але гомельчане не адказваюць.

Пад напорам Сноўскага ФЗВ соцдагавор абгаварылі на агульным сходзе школы, вылучылі двух вучняў для заключэньня дагавору. Але абраныя нічога ня робяць. Жлобінцы і сноўцы прысылаюць напаміны, але адказаў не атрымоўваюць.

У школе за апошні час пагоршылася дысцыпліна. Прыкмячаюцца прагулы. Вучань ЗА'ДАЙ прапусьціў 4 дні таму, што спужаўся залікаў(!). Спазьненьні—гэта сталая хвароба ФЗВ. У час работы вучні размаўляюць, кураць, гуляюць, карацей кажучы - соцспаборніцтва ў ФЗВ зышло на нішто. Бюро ячэйкі на гэта не рэагуе.

Дзякуючы гэтаму ў бягучым навучальным годзе пасьпяховасьць зьнізілася.

Дзе „левы“, дзе правы?

Работа гурткоў, чытальні, работа з адсталымі пастаўлена вельмі дрэнна. Фабзавучнік ня ведае адкуль і ад чаго ў нас маюцца гаспадарчыя цяжкасьці, ён не разьбіраецца, што такое „левы“ і „правы“ ўхіл, толкам ня можа разабраць, што такое генэральная лінія партыі.

Аб колектывізацыі сельскай гаспадаркі нічога ня ведаюць. Ніякага шэфства ў нас няма.

Ніякай бязбожнай работы ў нас не вядзецца. Пры заводзе, дзе працуюць фабзайцы, маецца гурток бязбожнікаў, які таксама нічога ня робіць.

Замест таго, каб змагацца з права-ўхілісцкімі настроямі, змагацца з антэсымітызмам, шовінізмам, некаторыя фабзайцы самі схільны думаць, як правыя ўхілістыя.

Вельмі дрэнна абстаіць справа з насьценгазэтай. За 6 месяцаў газэта вышла ўсяго два разы, а пісалі ў ёй усяго 3-4 чалавекі.

„Каб гэтага больш ня было, —а то глядзі!..“

Крытыка і самакрытыка не зьяўляюцца тут зброяй для выжываньня недахопаў. Тут ня толькі змазваюць самакрытыку, але ке вельмі часта ЗАЦІСКАЮЦЬ. Вось, напрыклад, вучань ЦІТЭНСКІ пракрытыкаваў фабзайца Янцэвіча. Апошні выклікае Цітэнскага і пагражаючы гаворыць—„КАБ ГЭТАГА БОЛЬШ НЯ БЫЛО. А ТО ГЛЯДЗІ!..“

Калі на каго-небудзь зьявіцца заметка ў насьценгазэце, дык прабраны не стараецца выжыць свае недахопы, а шукае рабкора, які напісаў гэтую заметку, каб „пакацаць“ яму..

Ня гледзячы на тое, што ў школе лічаецца вялікая колькасьць дзяўчат, сярод іх ніякай работы не вядзецца. Дзякуючы гэтаму няма і таварыскіх адносін да дзяўчат. На дзяўчыну глядзяць не як на таварыша, а як на дзяўчыну. Былі выпадкі, калі дзяўчына выступаючы ўказвала на недахопы нашай работы, жадаючы выжыць іх, а яе перабівалі, пасьля яе выступалі з гарачымі прамовамі,—„пустая бочка“, „карова“, „баба нічога дзельнага ня можа даць“. Многія нават лічаць немэтазгодным прымаць у фабзавуч дзяўчат. Што, моў „баба можа зрабіць, — павучыцца і выйдзе замуж“.

„Плячавы“ пшык

Вучком выпрацаваў прыгожы і вялікі плян работы—„О.—мы зробім!“—хваліліся вучкомаўцы (!) А ў выніку плян застаўся плянам, нічога ня зроблена. Старшыня вучкому нават ня ведае ўсіх сваіх членаў. Калі трэба было склікаць паседжаньне вучкому, ён бегаў ад аднаго вучня да другога і пытаўся хто з іх член вучкому.

Фабзайцы ў агульнай профрaботе заводу Ланцуцкага таксама ня прымаюць узелу. Вельмі дрэннае наведваньне агульных сходаў, дрэнны ўдзел вучняў у вытворчых нарадах і камісіях.

Цяпер цікава паслухаць якім уплывам і аўтарытэтам карыстаецца, якую работу праводзіць комсамольская ячэйка. Як факт прывядзем адзін комсамольскі сход.

Старшыня: — пераходзім да спрэчак... хто хоча выказацца (пауза) хто хоча гаварыць (цішыня)—тав. Сідарчук (актывісты),—можа ты скажаш (пауза). Ну, таварышы, так няма аб чым гаварыць? (маўчаньне)—таварышы, выкажэцеся хто-небудзь!.. Ад гэтых просьбаў нават становіцца сорамна. Каб выручыць з няёмкага становішча, выступае „кваліфікаваны“ прамоўца. Навічкі не выступаюць. Некаторыя лічаць грамадзкую работу балбатнёю.

Вельмі шмат гаварылі аб беларусізацыі, шмат выносілі пастаноў аб пераводзе ўсяе работы на беларускую мову, складалі шмат плянаў, а калі прыглядзецца на справе, дык нічога ня робіцца. З 14 чалавек у 3-й сталярнай (выпускной) групе па беларускай мове 12 чалавек атрымалі нездавальняючыя адметкі. Быў організаваны беларускі гурток, але адміністрацыя прымушана была яго зачыніць, бо вучні не наведвалі гэты гурток. Вельмі рэдка выступаюць на беларускай мове. Калі хто і выступіць, дык пачынае гаварыць па-беларуску, а канчае па расійску.

Юнкорыя неаднокраць пісалі ў „Чырвоную Зьмену“ аб недахопах у школе, але не даводзілі гэту справу да канца.

Юнкорыя ФЗВ праз газэту „Чырвоная Зьмена“ крытыкавала работу ФЗВ, але колектыў і РК комсамолу і партыі не рэагавалі на гэтую крытыку. І ня дзіва, што ў выніку фабзавуч апынуўся ў такім становішчы. А колькі ёсьць яшчэ фактаў, што не ахоплены маім лістом. Але я лічу, што і так вынікі напрашаюцца з усяго вышэйсказанага. Фабзавуч павінен быць аздароўлен.

ЦІШКА ВЕРНЫ.

Малюнак юнкораўскай брыгады Гомельскага ФЗВ.



У часе абедзеннага перапынку чытае „Чырвоную Зьмену“

РЫХТУЕМ КАДРЫ

У Барысаве на курсах па падрыхтоўцы ў ВНУ налічваецца 40 слухачоў, добра наведваюць 32. Яны забясьпечаны рознымі падручнікамі і літаратурай. Кожнаму выдзелена па 8 руб. для набыцьця вучнёўскіх прыладаў. Заняткі праводзяцца 4 разы ў тыдзень. Слухачы курсамі здаволены.

ЗАХАР ГУРЭВІЧ.

Ніякай працы не вядзецца

Ячэйка КСМ Менскай школы вучнёўства МББ чыгункі налічвае больш 100 комсамольцаў. Працы сярод іх ніякай не вядзецца. Комсамольцы не разумеюць пытаньняў організацыі ўдарных брыгад. Ёсьць факты скурніцтва. Вучні-комсамольцы ня лічацца з прадпрыемствам. У кожнага казённыя адносіны да маемасьці прадпрыемства і школы. Рвуць знарок спэцвопратку, потым складаюць акт і атрымліваюць новую. Першым паказаў прыклад сэкратар ячэйкі.

Пры рамонце вагонаў заўважваюцца нясумленныя адносіны да запасных частак і інструманту. Прагулы — звычайнае зьявішча. Яшчэ горш абстаіць справа з выхаваўчай работай. Да політвою работы амаль што не праводзілася. Вучні задавальняліся мэтадам „зуброўкі“ адказаў на запытаньне. З новымі вучнямі таксама не вядзецца ніякай працы.

Старыя вучні, якія канчаюць школу, ня ўцягваюцца ў шэрагі КСМ. Праз кожныя два тыдні бывае вечар самадзейнасьці, які бяз скокаў не абыходзіцца. На вечар даюць запрашальныя білеты толькі таму вучню, які мае на ўвазе прывесьці дзяўчыну.

Ленінскія дні не праводзіліся і нічым не адзначыліся (мусіць таму, што ня было танцулек). Комсамольцы політычна неадукаваны. Не разумеюць тых цяжкасьцяў, якія перажывае краіна і разам з адсталымі рабочымі прадпрыемства цягнуцца ў хвасьце.

Рабочы Дарожка 19 год сыстэматычна крадзе розны матар'ял з вытворчасьці. Ячэйка зусім ня цікавіцца гэтым пытаньнем.

Сябра бюро ячэйкі хадзіў на суд абараняць свайго сябра па школе хулігана Іваноўскага. На піонэрпрацу вылучылі комсамольца за якім прыкмячалася п'янка, хуліганства, політычна мала адукаванага.

Пасьля таго, як школа абвясьціла сябе ўдарнай і прыняла выклік Віцебскай школы, вучні к сходу адносьліся з найвялікшай пасыўнасьцю.

Трэба дадаць, што пры школе існуе парт'ячэйка, якая амаль ня кіруе працай ячэйкі КСМ. Патрэбна зараз-жа перабудаваць усю работу і накіраваць яе ў лепшы бок па задавальненьню вучняў.

А. Якуб.

Толькі цяпер узварушыліся...

4-га верасьня 1928 году ў Віцебску быў організаваны Будвуч, які складаўся з двух цэхаў—арматурнага і тынкавальна-каменнага. Комплектаваньне Будвучу правялі вельмі дрэнна,—туды папалі хлопцы, якія працавалі бронь-вучнямі ў розных установах.

Цяпер ужо організаваны новы вадаправодна-цёплаправодны цэх. Соцыяльны склад падабраны даволі добры, дзяцей рабочых налічваецца 37 чалавек, служачых—5 чалавек. У працы Будвучу маецца цэлы шэраг недахопаў. У арматуршчыкаў на 16 чалавек маецца 4 падтрыманых кусачкі і 6 шчыпцоў, зусім нягодных для работы.

Тэорэтычныя заняткі пачынаюцца а 6 гадзіне ўвечары і канчаюцца а 9 з паловаю. Пасьпяховасьць, з прычыны позьняга часу заняткаў дрэнная. Каб ісьці на работу, хлапцы павінны ўстаць а 5-й гадзіне раніцы,—дзякуючы гэтаму не дасыпаюць. З-за адсутнасьці памяшканьня вадаправодны цэх тэорыяй зусім не займаецца. Пытаньне з памяшканьнем вырашаецца з першых-жа дзён організацыі Будвучу, але дагэтуль яшчэ ня вырашана.

Адсутнасьць памяшканьня для заняткаў, як дзённых, так і вячэрніх ставіць пад пагрозу і новы набор.

У школе няма падручнікаў па спэцыяльных прадметах. Спэцыялістыя чытаюць лекцыі, а вучні толькі слухаюць. За 2 з паловаю месяцы адбылося толькі адно пасяджэньне школьнае рады. Апошняя вылучыла тры програмныя камісіі, але яны нічога не зрабілі.

Прараб пабудовы швэйнай фабрыкі **Фрадкін** беспадстаўна не падпісваў ведамасьцяй на выплату зарплаты рабочым, зьдзекваўся з інструктара брыгады—старога рабочага-вылучэнца за крытыку недахопаў.

Комсамольская ячэйка таксама прымае слабы ўдзел у рабоце Будвучу, яна нічога не зрабіла ў сувязі з новым наборам у школу.

Ячэйка налічвае 8 маладых комсамольцаў, яна ня здолела стаць кіраўніком прадпрыемства, а цягнецца ў хвасьце мас.

Толькі ў апошні час узварушыліся. Даручылі „Лёгкай кавалерыі“ заняцца пытаньнем высьвятленьня соцыяльнага становішча кандыдатаў.

Л.

У лапах кулацтва

У практычнай працы па ліквідацыі кулацтва мы маем цэлы шэраг скрыўленьняў класавай лініі. Асабліва гэта яскрава сьведчыць Рубілкаўскі сельсавет Самахваловіцкі р., які па маёмасным становішчы зьяўляецца адным з моцных кулацкіх сельсаветаў. Па сельсавеце індывідуальна абкладзена 100 гаспадарак, але заможніцкія і кулацкія гаспадаркі ня поўнасьцю выяўлены. Старшыня кажа, што „кулакоў у нас няма“, бо сам адзін з ярых і моцных кулакоў.

Старшыня сельсавету т. Шэўчанка ўтаіў ад падатку ў сваёй гаспадарцы 4 дзесяціны зямлі, дзьве каровы і двое коняй. У час праводзеньня падрыхтоўчай кампаніі па колектывізацыі ў кулака Я. Я. Дзядзюлі ў Краснае была папойка, на якой прысутнічалі кулакі, настаўніца з Мялешка (Шабунеўская школа) старшыня сельсавету. Тут абгаварваўся „плян дзеяньня“. Набраўшыся гарэлкі да страты прытомнасьці пачалі сьпяваць „ойча наш“ і „яшчэ польска ня згінэла“.

На заўтра кулак хвараіў, ходзячы па вёсцы: „Цяпер я нікога не баюся, ёсьць яшчэ і ў савецкай уладзе добрыя людзі, якія змогуць пастаяць і за мяне“. Выпадкаў п'янкі было шмат, дзе першым удзельнікам быў старшыня сельсавету.

Цяпер некалькі слоў аб сэкратары: Сэкратар сельсавету т. Шчасьлёнак (даходнасьць з гаспадаркі 688 рублёў), карыстаецца наёмнай сілай і абараняе інтарэсы кулацтва. Бедната і серадняки яго ня цікавяць. Праца ў сельсавеце праводзіцца дзеля адводу вачэй. Прэзыдыум сельсавету таксама нездаровы. Сябра сельсавету Вераб'ёва, яна-ж і сябра РВК гаворыць: „Калі гаспадар жыве добра і ня мае батрака, то мы індывідуальна абкладаць не павінны, трэба даць яму магчымасьць разьвіваць сваю гаспадарку“.

Невядома зачым сочыць РВК і РК партыі? Што яны зрабілі па аздараўленьню сельсавету? Чакаем адказу.

Вось каго Рубілкаўскі сельсавет лічыць „беднатою“ і папрымаў у колгас. Іцка Бэрнштэйн з вёскі Краснае мае 14 дзесяцін зямлі, 5 кароў, 1 каня. Эксплёатуе пастаяннага батрака і сэзонных. Мае заезжы двор, раней меў смалакураны завод. Прыпісаў пяць едакоў.

Адна з дачок Іцкі Ліба вучыцца ў БДУ і атрымоўвае дзяржаўную стыпэндыю.

Г. І. Дзядзюля з вёскі Краснае мае 20 дзесяцін зямлі, 3 коняй, 6 кароў, жнярку, скарбовы будынак, малацілку, сячкарню і інш. сельска-гаспадарчыя машыны, якімі абслугоўвае кулакоў. Яго старэйшы сын Сымон фактычна выключаны з ліку едакоў, працуе ў малочнай арцелі, а жыве ў бацькі, другі—Уладзімер ў Менску на юрыдычных курсах.

А. А. Бязьмен з вёскі Краснае мае 10 дзесяцін зямлі, 2 каровы, цёлку, 3 коняй, трыер, малатарню, сячкарню і інш., утаіў ад падатку 18 калод пчол. Эксплёатуе батрака. Сам былы інспэктар народнай асьветы за працу ня вельмі бярэцца, а выяжджае на шыі наёмнай рабочай сілы. Такіх гаспадарак ёсьць больш 50. Усе яны маўчаць і падмазаўшыся скрыта праводзяць варожую політыку. Шмат хто з іх ужо напалову пазбывалі сваю маемасьць і сельсавет ніякіх захадаў ня ўжывае. Шмат ёсьць выпадкаў, калі серадняка прыраўноўваюць да кулака. Так, напрыклад, Дзядзюшка А. С., які мае 1 каня, 2 каровы, разваленыя будынкі, 12 дзесяцін зямлі, абкладзены індывідуальна і ў колгас ня прыняты.

На хутары Старынцы, гэтага-ж сельсавету гр-н Аліноўскі Я., якога можна лічыць моцным серадняком, шчыра вядзе агітацыю за збыт жывёлы і іншай маемасьці. Яго сыны дапамагаюць яму ў гэтай справе. Пінчук з вёскі Баравікі—кулак гэтак сама вядзе агітацыю за збыт маемасьці.

У засьценку Курганьне маецца моцны кулак, які мае 17 дзесяцін, 3 коняй, 3 каровы і добрыя будынкі, карыстаецца сэзоннай рабочай сілай. Дагэтуль яшчэ не абкладзены індывідуальна затым, што сябра сельсавету Пілецкі Тодар меў з ім цесную сувязь і абараняў яго. У гэтым-жа самым засьценку Курганьні ёсьць другі злосны кулак які адкрыта выступае супроць савецкай улады кажучы, што „існаваньне колгасаў немагчыма, бо ўсё сялянства узьдыме бунт і ў надыходзячай вясьне немінуча разгарыцца вайна“.

РК КП(б) і РВК неабходна прыняць рашучыя захады да зьнішчэньня маючагася становішча ў гэтым сельсавеце.

Жороткі.



НА ЗДЫМКУ: Работніцы ліновачнага цэху Менскай галянтарэйнай фабрыкі Рычагова, Занеўская, Караваева і Вішнеўская, якія організавалі вытворча-бытавую комуну.

ПРОФСАЮЗНЫЯ КОНФЭРЭНЦЫІ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ—ПРАВАЛЬВАЮЦЦА

УЧОРА МЫ ПАВЕДАМЛЯЛІ АБ ПРАВАЛЕ КОНФЭРЭНЦЫІ САВГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ, СЁНЬНЯ МЫ СІГНАЛІЗУЕМ АБ ПРАВАЛЕ КОНФЭР. ПАПЕРНІКАЎ

Гэтымі днямі на старонках нашай газэты паведамлялася аб падрыхтоўцы міжсаюзнай конфэрэнцыі фізкультурнікаў у цішы габінэтаў ВСФКБ і ЦСПСБ. На падставе волыту правядзенай усебеларускай конфэрэнцыі фізкультурнікаў саюзу папернікаў можна сьмела сказаць, што конфэрэнцыя рыхтуецца ня толькі ў цішы габінэтаў, але... і пры надзвычайна фармальных бюрократычных адносінах да яе з боку ВСФКБ.

На конфэрэнцыі саюзу папернікаў прадстаўнік ВСФК тав. ТРАСКОЎСКІ, адказаўшы пасьля дакладу на запытаньні парашыў, што яму там болей няма чаго рабіць.

Якая справа яму—работніку ВСФК—да спрэчак, да выступленьняў з месц, якая справа яму да таго, што з фізкультурным рухам у саюзе папернікаў справа дрэнь, што перавыбары бюро гурткоў былі праваленыя і праводзіліся ў другі раз?

Гэта бюрократаў з ВСФКБ не датычыцца.

Выступленьні дэлегатаў гавораць АБ ПАГРАЖАЮЧЫМ СТАНОВІШЧЫ НА МЯСЦОХ. Пастанова ЦК УсеКП(б) праламляецца ЧАРАПАШЫМІ ТЭМПАМІ. Яшчэ дагэтуль профорган заводу ня лічаць сваім абавязкам кіраваць фізкультурай. Ёсьць факты, калі профпрацаўнікі заяўляюць:—„ЛЫЖЫ можна ламаць, ЦП новыя дасьць“ (Чашнікі)—абмяжоўваючы на гэтым сваё „кіраўніцтва“.

На мясцох няма дастаткова яснага разуменьня пастановы ЦК УсеКП(б), ня ведаюць ЯК ПЕРАБУДАВАЦЬ ПРАЦУ—ды ніхто гэтаму і ня вучыць, нават працаўнік ВСФК на конфэрэнцыі ня здолеў гэтаму навучыць, знашоўшы патрэбным сваё адсутнічаньне апраўдаць „об'ектыўнымі“ прычынамі.

Мы лічым, што такія бюрократычныя адносіны ВСФК ня толькі не садзейнічаюць, а значна тармозяць пасьпяховае праламленьне пастановы ЦК УсеКП(б) у нізох.

Э. К.

Фізкультура адарвана ад грамадзка-палітычнага жыцьця

Пазаўчора ў Менску скончыла сваю работу першая усебеларуская конфэрэнцыя фізкультурнікаў саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, на якой прысутнічала 22 дэлегаты.

Конфэрэнцыя заслухала даклад аб фізкультурнай рабоце ў сувязі з рашэньнямі ЦК УсеКП(б) і садаклад аб стане фізкультуры ў саюзе сельгас. і лясных рабочых.

Выступіўшыя ў спрэчках таварышы **усе як адзін адзначалі, што фізкультурная работа сярод рабочых савгасаў і батракоў і наогул сябраў саюзу пастаўлена дрэнна.** Ніхто на гэта не звярочвае ўвагі. Дэлегат **Хэсін** у сваёй промове сказаў, што фізкультурная работа залежыць ня толькі ад арганізацыі яе, але і ад кіраўніцтва зьверху—мясцкомаў і ЦП саюзу.

Тав. Бэргер гаворыць аб тым, што з боку рабочкомаў гор. Менску ня было праведзена падрыхтоўчай работы да конфэрэнцыі, дзякуючы чаму масцца адсутнасьць некаторых дэлегатаў.

Конфэрэнцыя ў сваёй рэзолюцыі па дакладзе адзначыла, што фізкультурная работа сярод сельскагаспадарчых, лясных рабочых і батракоў разгорнута зусім слаба. **Усяго па саюзу налічваецца 72 гуртка, якія ахопліваюць 1375 чалавек альбо 2,3 проц. агульнай колькасьці сябраў саюзу.**

Слабое арганізацыйнае замацаваньне гурткоў фізкультуры і адарванасьць іх ад грамадзка-палітычнага жыцьця і працы профарганізацый. **Адсутнасьць кіраўніцтва з боку саюзных арганізацый зьверху данізу.** Невысьветленьне сацыяльнага складу сябраў фізгурткоў і выпадкаў засьмечанасьці гурткоў соцыяльна-чужымі элемэнтамі.

Усё гэта з усёй яскравасьцю сьведчыць аб тым, што ў становішчы фізкультурнай работы няма пералому ў адпаведнасьці з рашэньнем ЦК УсеКП(б) і гэтае на сёньняшні дзень яшчэ незабясьпечана кіраўніцтвам.

Яўхім Сталёвы.

Ленінскім ударным тэмпам

Комсамольская організацыя кулямётнага эскадрону Самарскага палка ў сувязі з агітпаходам абвясьціла сябе ўдарнай, і ва ўдарным парадку прыняла работу ў сваёй падшэфнай частцы—Ратамка.

Там быў склікан сход комсамольцаў, дзе было пастаўлена пытаньне аб 100 проц. уступленьні комсамольцаў у колгасы. Комсамольскі сход пастанавіў работу па колектывізацыі праводзіць ударным парадкам. Тут-жа рашылі пачаць падпіску на трактар для колгасу. На агульным сходзе беднаты вёскі комсамольцы прыйшлі з організаванай сілай з адзіным думкамі за 100 проц. ахоп бядняцка-серадняцкіх гаспадарак колгасамі. Да моманту нашага прыезду мелася 38 гаспадарак у колгасе, цяпер—90. Ня ўступіла яшчэ ў колгас каля 10 гаспадарак. Пасьля сходу мясцовая комсамолія разам з вайсковай часткай наладзілі гульні.

На заўтра вайскоры, комсамольцы ва ўдарным парадку ў некалькі гадзін пераварылі кулацкую хату ў хату-чытальню.

Працуюць дружна,—выкідаюць з шафаў буталькі, рыызё, а ў гэтыя шафы ўкладаюць кнігі, якія чырвонаармейцы прывезьлі для сваіх падшэфнікаў. Выпусьцілі насьценгазэту, вылучылі некалькі хлапцоў у брыгаду, якая зараз накіравана там для організацыі колгасу ў хутарах Анолес, Града, Крыжоўка.

Задачы, пастаўленыя перад намі, выканаем ленінскім ударным тэмпам.

Г. Ш.

Комсамольцы Ленінградзкай фабрыкі Белдзяржкіно організавалі комуну

Мы, комсамольцы фабрыкі Белдзяржкіно (Ленінград), аб'ядналіся ў комуну, дзе будзем організаваць сваё жыцьцё выключна на комуністычных прынцыпах.

Просім Белдзяржкіно, пры складаньні проэктаў пабудовы беларускай кінофабрыкі ў Віцебску, улічыць пабудову вялікага памяшканьня для комсамольскай комуны.

Выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу ўсіх комсамольцаў Беларусі.

Гарзлік В., Герштэйнзагр С., Крэндзель С., Мітлін, Рагоўскі, Таўбэ М., Шапіра І. і Шаргародзкі.

Коратка аб усім

* Прэзыдыум цэнтральнага бюро юных піонэраў зацьвердзіў тэматычны плян юнсэктару БДВ па выданьні мастацкай літаратуры для дзяцей на 1930 год.

* З 20 лютага ў Менску адчыняюцца 7-месячныя настаўніцкія курсы. На курсы прымаюцца асобы з сярэдняй асьветай. Скончыўшыя сямігодкі могуць быць прыняты па рэкомэндацыі грамадзкіх організацый і ніжэй раённага маштабу.

* Сёньня пры ЦБ ЮП адчыняецца нарада старшынь акруговых бюро ЮП па пытаньню ўдзелу піонэрорганізацыі ў вясновай сельска-гаспадарчай кампаніі аб выкананьні дзяржаўнага заданьня і інш.

Агітсамалёт ТСА-Авіяхэму ў Менску

13 лютага ўпаўнаважаны ЦС ТСА Авіяхэму СССР тав. Фёдараў і лётнік тав. Кізіл, якія прыляцелі на агітсамалёце „Усе ў ТСА-Авіяхэм“, выступілі з дакладам аб задачах ТСА-Авіяхэму на рабочых сходах заводаў „Энэргія“ і „Комунар“, а таксама ў клюбе гарбароў.

14-га лютага экіпаж выступіў з дакладам у часе абедзенага перапынку ў першай друкарні, на швэйнай фабрыцы „Кастрычнік“, а ўвечары—у Доме Комасьветы імя Карла Маркса.



На здымку: агітсамалёт „Усе ў ТСА-Авіяхэм“

Шахматна-шашачная нарада

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ і культаддзел ЦСПСБ зварочваюцца да ўсіх комсамольскіх ячэек тых прадпрыемстваў, якія будуць ахоплены 5-дзёньнікам „шахматыстага і шашыстага“, з прапановай прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні гэтага пяцідзёньніка.

Комсамольскія ячэйкі павінны вылучыць са свайго складу па адным комсамольцу, якія будуць адказны за падрыхтоўку і правядзеньне пяцідзёньніка на ўсіх прадпрыемствах.

Для інструктаваньня вылучаных таварышоў „Чырвонай Зьмены“ сумесна з культаддзелам ЦСПСБ склікае шахматна-шашачную нараду. *Нарада адбудзецца 17 лютага а 7-й гадзіне ўвечары ў* памяшканьні культаддзелу ЦСПСБ (плац Волі, дом Працы, другі паверх).

Ліст у рэдакцыю

Ня спаўшы суткі, мы прыехалі ў Менск і абгрунтаваўшыся на паведамленьні „Чырвонай Зьмены“ за 11 гэтага месяцу, мы думалі, што нам пры дзецца хутка адпачыць. Выходзім на пэрон. Нас сустракаюць... але не прадстаўнікі штабу, а вялікія літары на шпалерной паперы паўтараючыя нам тыя-ж паведамленьні, што і ў „Чырвонай Зьмене“.

Дзьве гадзіны мы чакалі, каб сустрэць нашых сустракаючых, але віднаць, у той час, калі мы марылі аб іх фігурах, яны захапляліся залатымі марамі ў сьне. Ну, мы тут давай званіць у ЦК КСМ, а там ні духу. У НК РСІ—там ні гуку.

На кватэры Палякова і Рындзіча тэлефонаў не аказалася.

Я-б хацеў запытаць т. Рындзіча, ці часта яму па рабоце прыходзіцца праяўляць такую „ўвагу—бюрократычную? І нахай ён нам адкажа: які быў у яго плян складзены па сустрэчы дэлегацыі?

Ад імя Мозырскай дэлегацыі „ЛК“. Гізунтэрман.

ТЛУМАЧЭНЬНЕ

Дэлегаты зьлёту ад Мозыра правы, калі абураюцца тым, што іх ня сустрэлі на станцыі і яны вымушаны былі патраціць некалькі гадзін (з 11 гадзін ночы да 2 гадзін ночы), каб адшукаць гасьцініцу і там разьмясьціцца.

Тлумачыцца гэта становішча не бюрократычнымі адносінамі, а тым, што гаспадарчая камісія не ўлічыла расьпісаньня паездаў паміж Мозырам і Гомелем і чакала прыезд у альбо ўвечары 14-II, альбо з ранку у 6 гадзін 15-II.

Заява дэлегацыі будзе разгледжана на бюро ЦК ЛКСМБ.

Рындзіч.

Паштовая скрынка

ГРЫШКУ КАВАЛЕРЫСТУ і групе „ЛК“ Самахвалаўшчыны—выпісы з вашых сьпісаў аб чужых элемэнтах накіраваны ў адпаведныя ўстановы і організацыі.

КІНЖАЛУ — „Кулак пэнсіонэр“, ШМЭЛЮ—„Як дасецца ільгота“, АЎТАРУ—„Трэба ліквідаваць гэтага сябра“, і ЗАЯВІЦЕЛЯМ з в. Дубовы Лес—здымкі накіраваны ў адпаведныя ОРГАНІЗАЦЫІ ДЛЯ РЭАГАВАНЬНЯ.

ЗЯЛІНСКАМУ—Ваш ліст накіраван акрпрокурору.

НАЧШТАБУ „ЛК“—„Распачнем працу“, Каст. МАКАРЭВІЧУ—„Аб зьвёце „ЛК“, ЧАКАЮЧАМУ—„Як ячэйка КСМ рыхтуецца да зьлёту“, КАРТМАНУ—„Зьлёт „ЛК“ Каралінскага р-ну“, ГРЫШАВУ—„Лёгкая кавалерыя“ на паперы“—допісы для друку не падыходзяць і ВЫКАРЫСТАНЫ НЯ БУДУЦЬ.

„ЛЁГКАМУ КАВАЛЕРЫСТУ“—„Пад маскай бедняка“, ВАСІЛЮ КРУКУ—„Кулацкая ячэйка“, ВАЖАТАМУ—„Лёгкай кавалерыі“—„Падмалі сор“, ЛІПСКАМУ І.—„Пад маскай батрака“, ВЕДАЮЧАМУ—„Нікакі літасьці да чужых нам людзей“, ЯШКУ СУМНАМУ—„Ачысцім комсамол ад чужых элемэнтаў“, БУРАКУ—„Падсавет абараняе растратчыка“, КАВАЛЕРЫСТУ—„Наш кляса вораг пралез у школы“,—паколькі меры над асобамі, аб якіх вы пішаце, прыняты і прымяюцца—ДРУКАВАЦЬ НЕ МЭТАЗГОДНА.

КОЛГАСЬНІКУ—„Больш увагі“, ЛЯВОНУ КЛЮЧЫКУ—„Калі ня дужне бярыся за гуж“, ВОКУ—„Больш увагі ў ў рабкому“, ЯКУБУ СЬЛІВЕ—Ліст у рэдакцыю, ЛЯВІЦКАМУ—„Няма доктара“—па гэтых пытаньнях зьвярнецеся ў мясцовыя організацыі.

ШЭХТМАНУ І ЮФЭ.—вашы абвяржэньні зьмешчаны не будуць.—справа аб гэтым паслана праўленьню Мазырскай кооперацыі для расьсьледаваньня.

МІНІЗАНТУ—„Маленькая мышанка“, РУТКОВУ І. „У дзетканаўні Сомерва“ ВАРАНОВІЧУ—„Непарадкі ў Плешчыньскім крэдытным таварыстве“, СКАБЛОВУ—„Аб няверным судзе“, АЎТАРУ ДОПІСУ—„Патрэбна чыстка“—пералічаныя допісы ня пойдуць, няма адрасоў, А Ў НЕКАТОРЫХ—ПОДПІСАЎ.

Каралёву — Рэдакцыі конфлікт невядомы і зьвярнецеся па гэтаму пытаньню да мясцовых організацый.

Кастусю Ласьневічу — Па судовай справе падайце скаргу пры Акр. судзе.

Аўтару заметкі—„У нас усё добра“—ні пойдзе,—няма ні адрасу, ні подпісу.

Комсамольскі календар

МЕН. АБ ЮП. Сёньня а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні АК ЛКСМБ адбудзецца заняткі курсаў акцыбрадзіх работнікаў.

17-га лютага а 7-й гадзіне ўвечары ў Доме Пісьменьніка АДБУДЗЕЦЦА СХОД ФРАКЦЫІ КП(б)Б Бел. АПП. Яўка для ўсіх белапапаўцаў членаў і кандыдатаў КП(б)Б і ЛКСМБ абавязкова.

Бюро фракцыі.

...„Хто жадае—можа застацца“...

Аплявуха ФРК ЛКСМБ і прадстаўніка РК КП(б)Б Кінэра комсамольскаму актыву савецкіх ячэек

„9-га лютага 1930 году, а 6-й гадзіне ўвечары адбудзецца сход актыву Фрунзэнскага райкому ЛКСМБ сумесна з партпрымацаванымі, у памяшканьні АК партыі“—такая аб'ява зьявілася ў газэце „Чырвонай Зьмены“.

Прышоў дзень 9 лютага. У $6^{1}/_{2}$ гадзін увечары заля АК поўная народу. За сталом прэзыдыуму сакратар ФРБ тав. *Старобінец* і загадчык оргаддзелу райкому партыі Кінэр, які, адчыніўшы сход, заяўляе:

„Таварышы, мы разьлічвалі, што вас так многа не зьбярэцца і прымаючы пад увагу, што памяшканьне малое, што першае пытаньне наогул зачынене(?!) (пытаньне аб рэгуляваньні росту партыі), а па гэтаму мы пастаўм другое пытаньне першым, але-ж... па другім пытаньні не зьявіўся дакладчык, а таму просім актыў савецкіх ячэек аслабаніць крэслы для ўноўпрышоўшых комсамольцаў вытворчых ячэек“.

Тав. Кінэр, убачыўшы, што актыў і партпрымацаваныя савецкіх ячэек сваёй колькасьцю складаюць больш 50 проц. і што сваім выступленьнем выклікаў абурэньне, сказаў ціхім голасам: «Ну, што-ж таварышы, хто жадае—можа застацца» і зачыненае пытаньне стала адкрытым—але віхто застацца не захацеў.

Мы пытаем:

3 якога часу пытаньне аб рэгуляваньні росту партыі, якое ставіцца на сходзе *комсамольскага актыву*, становіцца закрытым для актыву савецкіх ячэек?

Чаму ў райкомах такое нявер'е ў актыўнасьць комсамольскага актыву, што прадугледжваецца памяшканьне на 40 проц.?

Ці наогул палітычна правільна аддаляць інтарэсы вытворчых ячэек ад інтарэсаў савецкіх? (ня лічачы розьніцы ў зьмесьце і формах работы ў савецкіх і вытворчых ячэйках).

Мы лічым, што Фрунзэнскі райком комсамолу, а таксама прадстаўнікі райкому партыі зрабілі ў гэтым выпадку вялікую палітычную памылку ў адносінах кіраўніцтва комсамольскімі ячэйкамі савецкіх ячэек.

Новік, Матусэвіч, Данцыгер, Кантаровіч, Казлова

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ.

Галоўлітбел № 599